Юрый ВЯРБІЦКІ,
фота Таццяны Русаковіч

# «Капыльскія пацехі»

**IV абласны фестываль гульні і гумару "Капыльскія пацехі" быў прысвечаны 115-годдзю з дня нараджэння Кандрата Крапівы і 70-годдзю альманаха "Вожык".**



У 1990 годзе на базе раённага цэнтра культуры быў створаны першы ў Мінскай вобласці тэатр гульні, які называўся "Капыльскія пацехі". Тэатр у 2000 годзе стаў ініцыятарам правядзення абласнога фестывалю гульні і гумару. Сёлета на славутай і гасціннай капыльскай зямлі прайшла прэзентацыя "Вожыка", адкрыццё выстаўкі карыкатур, гумарыстычных малюнкаў і шаржаў вядомага мастака-карыкатурыста Аляксандра Каршакевіча, а ад РВУ "Літаратура і Мастацтва" і Саюза пісьменнікаў Беларусі былі ўручаны ганаровыя граматы арганізатарам і ўдзельнікам свята.

Пасля адбылося ўрачыстае адкрыццё фестывалю і тэатралізаванае відовішча з удзелам гульнёвых калектываў, жартоўных гуртоў, гумарыстаў, прыпевачнікаў. І так жартавалі хлопцы і дзяўчаты, бабулі і дзядулі, што здолелі рассмяшыць нават сонейка, якое ўрэшце паказалася з-за аблажных хмар, каб зірнуць на капыльскіх жартаўнікоў. Таму і атрымалі яны, як кажуць, па заслугах. Строгае, але з добрым пачуццём гумару журы ў складзе старшыні, прафесара Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Пятра Гуда, дырэктара Мінскага абласнога цэнтра народнай творчасці Раісы Вайцяхоўскай, галоўнага рэдактара альманаха "Вожык" Юліі Зарэцкай, выкладчыка Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Аляксея Камінскага, галоўнага рэдактара часопіса "Вясёлка" Уладзіміра Ліпскага, галоўнага спецыяліста ўпраўлення культуры Мінскага аблвыканкама Галіны Ляйко і пісьменніка-"вожыкаўца" Паўла Саковіча вызначыла пераможцаў у дзвюх катэгорыях — "жартоўныя гурты" і "гульнёвыя калектывы". Імі сталі: драмгурток "Асарці" Клецкага РЦК (1-е месца), жартоўны гурт "Дубінскія фанабэры" Валожынскага раёна (2-е месца), гурт народнага гумару і жартаў "Смехаўё" Любанскага РЦК (3-е месца) і народны тэатр гульні і гумару "Капыльскія пацехі" (1-е месца), народны тэатр народнай гульні "Старадарожская лясёнка" (2-е месца), маладзёжны тэатр гульні "Балаган" Плешчаніцкага ГДК Лагойскага раёна (3-е месца) адпаведна. Дыпломамі I, II і III ступеняў узнагароджаны індывідуальныя выканаўцы Ганна Клімаш (Стаўбцоўскі РЦК), Аляксей Дунчанка (Сноўскі ЦКіА Нясвіжскага раёна) і Валянціна Шыманская ў дуэце са Станіславам Цвіркам (Лотвінскі СДК Капыльскага раёна).

***На здымку: вось яны якія вясёлыя, гурт народнага гумару і жартаў "Смехаўё".***

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКМ